*Такім чынам, у ранні Новы час абсалютызм быў самай распаўсюджанай формай праўлення ў Заходняй Еўропе. Толькі ў асобных краінах захаваліся саслоўна-прадстаўнічыя органы, дый тое пасля ўпартай і працяглай барацьбы, як, напрыклад, у Нідэрландах і Англіі.*

***Ключавыя словы:*** *абсалютызм, пратэкцыянізм, парламенцкая дзяржава, Людовік XIV, Жан-Батыст Кальбер.*

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце ўмовы, якія спрыялі фарміраванню абсалютнай манархіі ў краінах Заходняй Еўропы. Якія пласты насельніцтва былі зацікаўлены ў абсалютызме? Чаму?
2. Выкарыстоўваючы матэрыял пункта 1 параграфа, складзіце схему «Формы дзяржаўнага кіравання ў Заходняй Еўропе ў XVI–XVIII стст.».
3. Ахарактарызуйце сістэму кіравання ў дзяржаве з абсалютнай манархіяй. Выкарыстайце для аповеду схему на с. 68.
4. Растлумачце значэнне слоў Людовіка XIV: «Дзяржава — гэта я». Як у гэтай фразе праяўляюцца прыметы абсалютызму?
5. Чым у гісторыі Францыі вядомы Жан-Батыст Кальбер? Якую карысць прынесла яго дзейнасць дзяржаве?
6. Уявіце, што вы пабывалі пры двары Людовіка XIV. Раскажыце сваім суайчыннікам пра Версальскі палац, жыццё караля і яго прыдворных.

## § 12. Еўрапейскія канфлікты і войны

**1618—1648 гг.** **1701—1714 гг.** **1756—1763 гг.**

**Успомніце.** *Да якіх змен у міжнародных адносінах прывёў раскол у Еўропе ў выніку Рэфармацыі і рэлігійных войнаў?*

XVII–XVIII стст. у гісторыі Еўропы — гэта час вострых палітычных канфліктаў. Найбольшы ўплыў на іх развіццё аказвалі вялікія дзяржавы, самыя моцныя ў ваенна-эканамічным плане: Іспанія, Свяшчэнная Рымская імперыя, Францыя, Швецыя, Асманская імперыя, а таксама Расія, Англія і Прусія. Найбуйнейшымі ўзброенымі канфліктамі сталі Трыццацігадовая вайна, Вайна за іспанскую спадчыну і Сямігадовая вайна.

**Вы даведаецеся.** *Прычыны палітычных канфліктаў паміж еўрапейскімі краінамі. Як ваенныя сутыкненні змянялі межы еўрапейскіх дзяржаў і іх міжнароднае становішча.*

**1. Палітычная карта Еўропы і саперніцтва еўрапейскіх дзяржаў.** У цэнтры Еўропы размяшчалася велізарная імперыя, якая ўяўляла сабой аб'яднанне дробных германскіх дзяржаў, што знаходзіліся пад уладай князёў, герцагаў, біскупаў, курфюрстаў. Гэта была Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі на чале з аўстрыйскімі Габсбургамі. На ўсход ад яе знаходзілася Рэч Паспалітая, якая паступова прыходзіла ў заняпад. Яшчэ далей — Расія, якая ўмацоўвала свае пазіцыі.

Велізарную плошчу займала Іспанія. Яна валодала вялікімі калоніямі ў Амерыцы і адыгрывала прыкметную ролю ў палітычным жыцці Еўропы. Найбуйнейшымі дзяржавамі былі таксама Англія і Францыя.

Балканскія краіны і частка Венгерскага каралеўства былі заваяваны Асманскай імперыяй. Чорнае мора лічылася «ўнутраным турэцкім возерам». Асманская імперыя пагражала Аўстрыі, Расіі і Рэчы Паспалітай.

*Знайдзіце ўсе пералічаныя ў тэксце параграфа дзяржавы на карта-схеме на с. 74. Ацаніце ролю гэтых дзяржаў у міжнародных адносінах.*

Найбуйнейшыя еўрапейскія дзяржавы змагаліся за першынство ў Еўропе. Нярэдка падставай для вядзення войнаў выступала абарона веры. У гэты час Еўропа была падзелена паміж каталіцкімі і пратэстанцкімі ўладарамі. Да каталіцкіх краін адносіліся Італія, Аўстрыя, Францыя, Іспанія, да пратэстанцкіх — Нідэрланды і паўночныя краіны (Швецыя, Данія і часткова Англія). У Германіі, якая з'яўлялася ядром Свяшчэннай Рымскай імперыі, жылі і каталікі, і пратэстанты. Менавіта на тэрыторыі Германіі распачалася Трыццацігадовая вайна.

**2. Трыццацігадовая вайна (1618—1648).** Гэтая вайна закранула ў той ці іншай ступені амаль усе еўрапейскія краіны, таму яе можна назваць першай агульнаеўрапейскай вайной. Яна мела рэлігійны характар. У той жа час гэта была барацьба за ўладу паміж германскімі князямі-пратэстантамі і імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі, які адначасова з'яўляўся валадаром Аўстрыі і марыў стварыць адзіную каталіцкую імперыю.

117—119

Поспех спрыяў то аднаму, то другому боку. Спачатку перамагалі войскі імператара Фердынанда II. Здавалася, нішто не можа спыніць яго, і ён зверне ўсю Германію ў каталіцтва. Аднак у 1630 г. на баку пратэстантаў выступіў шведскі кароль Густаў II Адольф і разграміў войскі каталікоў. У 1635 г. нямецкія князі-пратэстанты, стомленыя ад баявых дзеянняў, выйшлі з вайны. Тады на іх баку выступіла каталіцкая Францыя. Каб аслабіць магутнасць аўстрыйскіх Габсбургаў, якія ўзначальвалі саюз каталіцкіх дзяржаў, яна была гатовая адступіцца ад сваіх прынцыпаў. Праз 12 гадоў новы імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі вымушаны быў прасіць міру.



Трыццацігадовая вайна

*З дапамогай картасхемы вызначце, якія еўрапейскія дзяржавы ўваходзілі ў габсбургскую кааліцыю (ваенна-палітычны саюз), якія — у антыгабсбургскую. Растлумачце, чаму гэтыя кааліцыі мелі такія назвы. Якая з іх абараняла інтарэсы каталікоў, а якая — пратэстантаў?*



Падпісанне Вестфальскага міру ў Мюнстары 15 мая 1648 г. Мастак *Герард Тэрбарх*. 1648 г.

**3. Вестфальскі мір.** У 1648 г. ваюючыя еўрапейскія краіны накіравалі сваіх прадстаўнікоў у Вестфалію (вобласць у Германіі), дзе былі падпісаны два мірныя пагадненні.

Згодна з Вестфальскім мірам Габсбургі па-ранейшаму валодалі сваімі фамільнымі землямі ў Аўстрыі, Чэхіі і Венгрыі і заставаліся самымі магутнымі з германскіх кіраўнікоў. Але іх улада над іншымі князямі значна паменшылася.

115—117

Мірная дамова замацавала раздробленасць Свяшчэннай Рымскай імперыі і гарантавала незалежнасць невялікім германскім дзяржавам. Князі атрымлівалі права абвяшчаць вайну і заключаць дамовы, выбіраць рэлігію для сваёй тэрыторыі. Дамова ўраўноўвала ў правах кальвіністаў з лютэранамі і каталікамі. Аднак іншыя пратэстанцкія групы па-ранейшаму падвяргаліся пераследу. Многія нямецкія пратэстанты эмігравалі ў Паўночную Амерыку.

*Якія дзяржавы атрымалі найбольшыя выгады паводле ўмоў Вестфальскага міру? У чым гэтыя выгады заключаліся?*

Еўрапейскія кіраўнікі прызналі незалежнасць Рэспублікі Злучаных правінцый (Нідэрландаў) і Швейцарыі. Пад кантролем Швецыі захаваліся некаторыя германскія землі ўздоўж Балтыйскага і Паўночнага мораў. Францыя атрымала ў валоданне частку Эльзаса і Латарынгіі і стала магутнай дзяржавай Еўропы. Межы,

устаноўленыя Вестфальскім мірам, заставаліся нязменнымі на працягу амаль 150 гадоў.

**4. Вайна за іспанскую спадчыну (1701–1714).** Французскі кароль Людовік XIV настойліва імкнуўся да пашырэння тэрыторыі сваёй дзяржавы. На поўдні Францыя ўжо дасягнула Пірэнеяў. Але Людовік XIV лічыў, што мяжа яго дзяржавы павінна распасцірацца ад Альпаў на ўсходзе да Паўночнага мора. З гэтай мэтай Францыя вяла войны з Рэспублікай Злучаных правінцый, Швецыяй, Англіяй, Іспаніяй і Свяшчэннай Рымскай імперыяй.

Самай разбуральнай была Вайна за іспанскую спадчыну. Яна пачалася ў 1701 г., пасля таго як унук французскага караля Філіп Анжуйскі (пад імем Філіпа V) атрымаў у спадчыну Іспанію і ўсе яе ўладанні.



Бітва пад Альмансай 1707 г. Мастак *Рыкарда Балака.* 1862 г.

*Падрыхтуйце паведамленне пра бітву пры Альмансе 1707 г. У расказе асвятліце:*
*1) арміі якіх дзяржаў прынялі ўдзел у гэтай бітве;*
*2) хто камандаваў войскамі з аднаго і другога боку;*
*3) якім быў вынік бітвы;*
*4) ці мела гэтая бітва значэнне для далейшага ходу вайны.*
*Прадстаўце паведамленне аднакласнікам. Пры расказе выкарыстайце карціну.*

Збліжэнне Францыі і Іспаніі выклікала незадаволенасць аўстрыйскіх Габсбургаў, ды і іншых еўрапейскіх манархаў.

*У чым былі прычыны Вайны за іспанскую спадчыну?*

Супраць Іспаніі і Францыі выступіла кааліцыя ў складзе Англіі, Нідэрландаў, большасці германскіх дзяржаў і Аўстрыі. Асабліва актыўнай была Англія, якая лічыла Францыю сваім асноўным праціўнікам не толькі ў Еўропе, але і за яе межамі. Вынікам сталі цяжкія гады змаганняў, у якіх Францыя пацярпела паражэнне.

Паводле Утрэхцкага міру 1713 г. Людовік XIV адмовіўся ад сваіх прэтэнзій на аб'яднанне французскай і іспанскай кароны. Філіп V застаўся каралём Іспаніі, але без права на французскі трон. Іспанія захоўвала свае амерыканскія калоніі, але яе ўладанні ў Італіі і Паўднёвых Нідэрландах перайшлі да аўстрыйскіх Габсбургаў. Англія атрымала французскія ўладанні ў Паўночнай Амерыцы, а таксама Гібралтар у Міжземнамор'і, які належаў Іспаніі. У выніку Вайны за іспанскую спадчыну, якая доўжылася да 1714 г., Францыя страціла сваё першынство ў Еўропе.

108—109

**5. Сямігадовая вайна (1756—1763).** У сярэдзіне XVIII ст. еўрапейскія дзяржавы зноў падзяліліся на два магутныя блокі: у адзін увайшлі Аўстрыя, Францыя, Расія, Іспанія, Саксонія і Швецыя, у другі — Англія, Партугалія і нямецкія дзяржавы Гановер і Прусія. Паміж імі распачаўся ваенны канфлікт 1756—1763 гг., які ўвайшоў у гісторыю пад назвай Сямігадовай вайны.

113—115

Ваенныя дзеянні ўпершыню адбываліся адначасова на тэрыторыі Еўропы, Азіі і Амерыкі. Англія і Францыя ваявалі з-за каланіяльнага кантролю над заморскімі тэрыторыямі ў Індыі і Амерыцы, а Аўстрыя, Прусія, Расія і Швецыя — у межах Еўропы. У вайне прымалі ўдзел усе еўрапейскія вялікія дзяржавы, а таксама большасць невялікіх дзяржаў Еўропы таго часу. Выбітны дзяржаўны дзеяч Вялікабрытаніі XX ст. Уінстан Чэрчыль назваў гэтую вайну «першай сусветнай».

*Як вы думаеце, чаму Сямігадовую вайну назвалі «першай сусветнай»? Растлумачце свой пункт гледжання.*

Вайна скончылася падпісаннем мірных дамоў. Французскія валоданні ў Індыі і Амерыцы адышлі Англіі. Прусія захавала за сабой Сілезію. Расія, войскі якой нават захапілі Берлін, не атрымала ніякіх тэрытарыяльных уладанняў.

*Такім чынам, XVII—XVIII стст. адзначаны працяглымі і кровапралітнымі войнамі. Найбуйнейшыя дзяржавы змагаліся за пашырэнне сваіх тэрыторый і за першынство ў Еўропе. Сямігадовая вайна скончылася перамогай англа-прускага блока. Прусія ўвайшла ў шэраг вялікіх еўрапейскіх дзяржаў. Іспанія і Швецыя перасталі лічыцца такімі.*

***Ключавыя словы:*** *Трыццацігадовая вайна, Вестфальскі мір, Вайна за іспанскую спадчыну, Утрэхцкі мір, Сямігадовая вайна.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Ахарактарызуйце міжнародную абстаноўку ў Заходняй Еўропе ў пачатку XVII ст. Выкарыстайце для адказу картасхему на с. 74.

**2.** Якую прычыну войнаў XVII–XVIII стст. вы б вызначылі як асноўную: рэлігійныя супярэчнасці або саперніцтва паміж еўрапейскімі дзяржавамі за палітычны ўплыў і тэрыторыі? Патлумачце сваё меркаванне.

**3.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Еўрапейскія войны XVII–XVIII стст.».

| Назва вайны | Хранала-гічныя межы | Праціўнікі | Асноўныя прычыны | Мірная дамова і яе асноўныя ўмовы |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

З дапамогай табліцы сфармулюйце адказы на пастаўленыя пытанні ў рубрыцы «Вы даведаецеся».

**4.** З дапамогай табліцы складзіце расказ пра войны XVII–XVIII стст.

**5.** Як вы разумееце выраз: «Падставай для вядзення войнаў з’яўлялася абарона веры»? У чым, на вашу думку, заключаліся сапраўдныя прычыны еўрапейскіх войнаў?